# УМОВЫ ВЯРТАННЯ

У адпаведнасці з законам, у прыватнасці, арт. 556–576 Грамадзянскага Кодэкса, прадавец абавязаны прадаставіць Кліенту тавар без дэфектаў.
Калі ў прададзенага тавара маецца фізічны ці юрыдычны дэфект, Кліент мае права падаць скаргу/рэкламацыю.

Хто мае права на вяртанне набытага тавару
Вы маеце права на вяртанне, калі купляеце як спажывец, гэта значыць:
а) вы пакупнік, які не вядзе бізнес;
б) вы займаецеся бізнесам і як фізічная асоба купляеце прадмет для сваёй дзейнасці, але пакупка не мае прафесійнага характару для вас.

У адпаведнасці з законам ад 30 мая 2014 года Аб правах спажыўца, кліент, які з'яўляецца фізічнай асобай, якая заключыла дамову на адлегласці або па-за памяшканнем прадпрыемства з мэтай, не звязанай непасрэдна са сваёй прафесійнай або гаспадарчай дзейнасцю (спажывец), можа на працягу 14 дзён з даты атрымання тавару ад яго адмовіцца без указання прычыны і без выдаткаў, за выключэннем выдаткаў на дастаўку тавару ў выпадку, калі кліент абраў спосаб дастаўкі тавару, адрозны ад найтаннейшага звычайнага спосабу дастаўкі, прапанаванага крамай. Такім чынам, інтэрнэт-крама gutenbergpublisher.eu не абавязана кампенсаваць пакупніку панесеныя ім дадатковыя выдаткі (звыш сумы самага таннага звычайнага спосабу дастаўкі, прапанаванага інтэрнэт крамай gutenbergpublisher.eu).
Прадавец можа адмовіць у праве на вяртанне, калі прадукт, які вы купляеце, адпавядае аднаму з наступных крытэрыяў (у адпаведнасці з артыкулам 38 Закона аб правах спажыўца), у тым ліку:
- дзённікі, перыядычныя выданні ці часопісы (за выключэннем пагадненняў аб падпісцы);
- рэчы, выраблены па вашай індывідуальнай замове, у адпаведнасці з вашымі рэкамендацыямі: напрыклад, футболка з прынтам, які вы распрацавалі. Для скасавання дамовы кліент павінен у пісьмовай форме падаць інтэрнэт-краме gutenbergpublisher.eu заяву аб скасаванні дамовы з адпраўкай пацверджання пакупкі, копіі чэка(фактуры) або прынамсі з указаннем нумара замовы, а затым неадкладна вярнуць тавар у належным стане ў інтэрнэт-краму gutenbergpublisher.eu па адрасе:

Gutenberg Publisher Sp. z o.o.
Adres: ul. Łobzowska 15-15, Kraków, Poland,
Kod pocztowy: 31-139

з пазнакай "Zwrot" (“Вяртанне”).

Вярнуць тавар трэба не пазней, чым на працягу 14 дзён ад дня, у які Пакупнік заявіў пра скасаванне Дамовы.
Кліент можа скарыстацца формай заявы для скасавання дамовы, якая з'яўляецца дадаткам № 1 да гэтых Правілаў. Выкарыстанне формы заявы для скасавання дамовы не з'яўляецца абавязковым.

Узор заявы для скасавання дамовы разам з падрабязнай інструкцыяй аб праве скасавання дамовы, якая з'яўляецца дадаткам № 2 да гэтых Умоваў, таксама адпраўляецца праз інтэрнэт-краму gutenbergpublisher.eu кліенту кожны раз з пацверджаннем умоў размешчанай замовы на электронную пошту на адрас, паказаны кліентам пры размяшчэнні замовы.

Каб выканаць умову 14-дзённага тэрміну, дастаткова выслаць заяву да яго заканчэння.

Неадкладна па атрыманні ад Пакупніка заявы аб скасаванні Дамовы, ТАА "Гутэнберг Паблішэр" перашле Пакупніку пацвярджэнне атрымання яго заявы ў форме папяровага ліста або на ўказаны Пакупніком для такога пацвярджэння адрас e-mail (калі на тое ёсць выразная згода — гл. Дадатак №1).

Інтэрнэт-крама ТАА "Гутэнберг Паблішэр" неадкладна, але не пазней за 14 дзён з дня атрымання заявы кліента аб скасаванні дагавора, кампенсуе кліенту ўсе выкананыя ім плацяжы, у тым ліку выдаткі на дастаўку тавара, у адпаведнасці.

ТАА "Гутэнберг Паблішэр" вяртае выплаты такім самым спосабам, які ўжыў Пакупнік, калі толькі Пакупнік не выкажа вырасна згоду на іншы спосаб вяртання, што не прадугледжвае ніякіх выдаткаў для Пакупніка.

ТАА "Гутэнберг Паблішэр" пакідае сабе права не вяртаць выплаты, пакуль не атрымае назад тавары або не будзе мець доказ іх вяртання — у залежнасці ад таго, што наступіць раней.

Спосаб дастаўкі пасылкі з таварам, які вяртаецца
Дастаўку тавара, які вяртаецца, аплочвае Пакупнік.

Упакоўка пасылкі з таварам, які вяртаецца
Як адпраўнік пасылкі вы несяце адказнасць за яе бяспечнае апакаванне, каб яна прыбыла прадаўцу непашкоджанай.
У кожнага перавозчыка ёсць свае інструкцыі па правільнай упакоўцы грузу. Вы ўбачыце іх, калі абярэце спосаб дастаўкі і адправіце форму вяртання тавару. Абавязкова азнаёмцеся з іх зместам, перш чым адпраўляць сваю пасылку.
Правільна абараніце тавар: выберыце апакаванне, адаптаванае да тавара, напрыклад, кардонную скрынку, фальгаваны пакет, які адпавядае аб'ёму пасылкі, і г. д. Выдаліце старую этыкетку; не наляпляйце этыкетку на арыгінальнае пакаванне тавара, толькі на кардонную скрынку ці пакавальны матэрыял. Калі набыты тавар прыбыў да вас на паддоне, таксама падрыхтуйце вяртанне грузу на паддоне.

Дадатак № 1:

## УЗОР ЗАЯВЫ ДЛЯ СКАСАВАННЯ ДАМОВЫ

(гэтую заяву трэба запоўніць і выслаць толькі ў выпадку, калі хочаце скасаваць дамову)

Мясцовасць і дата: ___________________________

Імя і прозвішча кліента (-аў): ___________________________________________________
Адрас кліента (-аў): ___________________________________________________________
Нумар банкаўскага рахунка: ____________________________________________________

Я/мы, падпісаная/падпісаны/падпісаныя ніжэй, гэтай заявай інфармую/інфармуем пра маё/наша жаданне скасаваць дамову дастаўкі наступных тавараў:

_____________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________

Адначасова, выключна для правільнай ідэнтыфікацыі маёй/нашай дамовы, падаю/падаём нумар замовы: _________________, і/або доказ пакупкі/копія доказу пакупкі. Дата заключэння дамовы / атрымання тавару: _____________________.

Выказваю / Выказваем згоду на перасыланне пацвярджэння атрымання gutenbergpublisher.eu гэтай заявы, што будзе сведчаннем скасавання заключанай дамовы, з дапамогай электроннай пошты на наступны адрас e-mail:________________________________.

_________________________
(подпіс)

Не выказваю / Не выказваем згоды на перасыланне пацвярджэння атрымання gutenbergpublisher.eu гэтай заявы, што будзе сведчаннем скасавання заключанай дамовы, з дапамогай электроннай пошты.

_________________________
(подпіс)

Адрас для карэспандэнцыі з мэтай скасавання дамовы:
Gutenberg Publisher Sp. z o.o.
Adres: ul. Łobzowska 15-15, Kraków, Poland,
Kod pocztowy: 31-139
e-mail: office@gutenbergpublisher.eu

Дадатак № 2

ІНСТРУКЦЫЯ АБ ПАРАДКУ СКАСАВАННЯ ДАМОВЫ

Працэдура скасавання:

1. Пакупнік мае права скасаваць гэтую Дамову на працягу 14 дзён ад даты атрымання пасылкі без тлумачэння прычын і без які-небудзь выдаткаў, без уліку кошту дастаўкі тавару ў тым выпадку, калі пакупнік выбраў для дастаўкі тавару іншы спосаб дастаўкі, чым звычайны найтаннейшы спосаб дастаўкі, прапанаваны ТАА “Гутэнберг Паблішэр”.
2. У сітуацыі, апісанай у п.1 гэтай Інструкцыі Gutenberg Publisher Sp. z o.o. не абавязаны вяртаць Пакупніку сродкі, выдаткаваныя ў сувязі з яго выбарам (вышэй за цану найтаннейшага звычайнага спосабу дастаўкі, прапанаванага ТАА “Гутэнберг Паблішэр”).
3. Час для скасавання дамовы заканчваецца па завяршэнні 14 дня ад дня атрымання пасылкі.
4. З мэтай скасавання Дамовы Пакупнік павінен выслаць на адрас ТАА “Гутэнберг Паблішэр” заяву аб скасаванні Дамовы ў пісьмовай форме. Да заявы аб скасаванні Дамовы трэба далучыць доказ замаўлення, яго копію або прынамсі падаць нумар замовы (гэта дасць нам магчымасць беспамылкова вызначыць замову, аб якой вядзецца), а далей неадкладна вярнуць тавар у непашкоджаным стане на адрас ТАА “Гутэнберг Паблішэр”:

Gutenberg Publisher Sp. z o.o.
Adres: ul. Łobzowska 15-15, Kraków, Poland
Kod pocztowy: 31-139

з пазнакай 'zwrot', што значыць “вяртанне”

5. Вярнуць тавар трэба не пазней, чым на працягу 14 дзён ад дня, у які Пакупнік заявіў пра скасаванне Дамовы.
6. Для скасавання Дамовы Пакупнік можа выкарыстаць узор заявы скасавання дамовы. Выкарыстанне ўзору сказавання Дамовы, аднак, не абавязковае.
7. Каб выканаць умову 14-дзённага тэрміну, дастаткова выслаць заяву да яго заканчэння.

Наступствы скасавання Дамовы:

1. Неадкладна па атрыманні ад Пакупніка заявы аб скасаванні Дамовы, ТАА “Гутэнберг Паблішэр” перашле Пакупніку пацвярджэнне атрымання яго заявы ў форме ліста або на ўказаны Пакупнікам для такога пацвярджэння адрас e-mail.
2. ТАА “Гутэнберг Паблішэр” неадкладна, не пазней чым праз 14 дзён з дня атрымання ад Пакупніка заявы аб скасаванні Дамовы вяртае Пакупніку ўсе выплаты, у тым ліку цану дастаўкі тавараў, з выключэннем дадатковых выдаткаў, што вынікаюць з выбранага Пакупнікам спосабу дастаўкі, адрознага ад найтаннейшага звычайнага спосабу дастаўкі, прапанаванага ТАА “Гутэнберг”.
3. ТАА “Гутэнберг Паблішэр” вяртае выплаты такім самым спосабам, які ўжыў Пакупнік, калі толькі Пакупнік не выкажа вырасна згоду на іншы спосаб вяртання, што не прадугледжвае ніякіх выдаткаў для Пакупніка.
4. ТАА “Гутэнберг Паблішэр” пакідае сабе права не вяртаць выплаты, пакуль не атрымае назад тавары або не будзе мець доказ іх вяртання — у залежнасці ад таго, што наступіць раней.
5. Пакупнік нясе адказнасць толькі за зніжэнне кошту прадмета ў выніку яго выкарыстання спосабам, які выходзіць за рамкі таго, што неабходна для ўстанаўлення прыроды,

характарыстык і функцыянавання прадмета. Кампакт-дыскі, DVD-дыскі, камп'ютарныя праграмы, захаваныя на носьбітах, неабходна вяртаць у арыгінальнай непашкоджанай упакоўцы (фольга не выдаленая, скрынка без пашкоджанняў). У выпадку парушэння ўпакоўкі кампакт-дыскаў, DVD-дыскаў, камп'ютарных праграм, запісаных на носьбіты (знята фольга, пашкоджана скрынка), права на адмову ад Дамовы ў Пакупніка не застаецца.

Увага: пераклад на беларускую падаем для зручнасці пакупніка. У выпадку спрэчак юрыдычную перавагу мае польская версія.